# ПЛЕНЭР 2017





# Пад знакам Скарыны
# Полацк у гравюрах сучасных мастакоў

Амялюсік Павел
Басалыга Андрэй
Дарожка Марыя
Мікалаўскіс Эвалдас
Нікішына Вольга
Піскун Сафія
Савіч Уладзімір
Шэлест Тамара
Якубаў Андрэй

24.08 – 02.09.2017

НАЦЫЯНАЛЬНЫ
ПОЛАЦКІ
МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ПОЛАЦКІ
ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК

БЕЛАРУСКІ САЮЗ МАСТАКОЎ

Сімвалічна, што ў дні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання менавіта ў Полацку адбыўся першы на Беларусі пленэр друкаванай графікі «Пад знакам Скарыны. Полацк у гравюрах сучасных мастакоў».

Полацк, дзе Францыск Скарына нарадзіўся, дзе прайшло яго дзяцінства, дзе жылі бацькі кнігадрукара, з яго імклівай Палатой, велічнай Дзвіной, старажытнымі будынкамі, ціхімі вуліцамі і таямнічымі мясцінамі, не мог не натхніць мастакоў, якія прынялі ўдзел у пленэры.

**Т. А. Джумантаева,**
**дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка**

Першы міжнародны пленэр друкаванай графікі — гэта сапраўды вельмі актуальная падзея ў мастацкім жыцці падчас святкавання 500 — годдзя беларускага кнігадрукавання. Беларускі саюз мастакоў не мог не далучыцца да такой знакавай падзеі и менавіта гэтым міжнародным пленэрам уславіць памяць вялікаму асветніку Францыску Скарыне. Мы спадзеемся, што гэты пленэр — добры пачатак і што мы працягнем гэтую традыцыю і будзем праслаўляць славутую Полацкую зямлю.

**Г. А. Отчык,**
**намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў**



Амялюсік Павел Валер'евіч, 1980 г. н., Мінск

Скончыў Рэспубліканскі каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка, Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў, аддзяленне манументальна-дэкаратыўнага мастацтва. Член Беларускага саюза мастакоў, член бюро секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў. Лаўрэат мінскага міжнароднага фестывалю лічбавага мастацтва «Terra Nova».



Час. Афорт; 9х11,5; 2017 г.



## Басалыга Андрэй Уладзіміравіч, 1970 г. н., Мінск

Скончыў Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава, Беларускую акадэмію мастацтваў (кафедра графікі). Член Беларускага саюза мастакоў, старшыня секцыі графікі Беларускага саюза мастакоў. Удзельнік і прызёр мноства нацыянальных і міжнародных выстаў і конкурсаў у галіне графічнага мастацтва і дызайну.



Дні і ночы 2. Афорт; 45x57; 2017 г.



Дарожка Марыя Аляксандраўна, 1984 г. н., Мінск

Скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (аддзяленне станковай графікі). Член Беларускага саюза мастакоў. З'яўляецца ўдзельнікам і дыпламантам многіх калектыўных выстаў, конкурсаў і пленэраў у Беларусі і за мяжой (Італія, Румынія).



Гродна. Фарны касцёл. Лінарыт; 85х118,4; 2017 г.



Мікалаўскіс Эвалдас, 1959 г. н., Каўнас

Скончыў прафесійнае вучылішча мастацтваў у Цяльшай, Дзяржаўны Інстытут мастацтвазнаўства (цяпер Віленская мастацкая акадэмія), аддзяленне графікі. З 1990 г. удзельнічае ў выставах.



Полацк. Малюнак; 32х45; 2017 г.



**Нікішына Вольга Вячаславаўна**, 1970 г. н., Мінск

Скончыла Мінскае мастацкае вучылішча імя А. К. Глебава, Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (кафедра графікі). Член Беларускага саюза мастакоў. Удзельніца мноства нацыянальных і міжнародных выстаў і конкурсаў у галіне графічнага мастацтва.



Абліччы. Афорт; 34,5х61,5; 2017 г.



Савіч Уладзімір Пятровіч, 1952 г. н., Мінск

Скончыў Рэспубліканскую спецыялізаваную школу па музыцы і выяўленчым мастацтве, Беларускі дзяржаўны тэатральна-мастацкі інстытут (цяпер Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў). Член Беларускага саюза мастакоў. Выкладаў і быў загадчыкам кафедры графікі Беларускай акадэміі мастацтваў. Прафесар, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь. Узнагароджаны ордэнам Францыска Скарыны і Дыпломам Івана Фёдарава. Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. З 2007 па 2013 г. займаў пасаду старшыні БСМ. З'яўляецца ўдзельнікам і дыпламантам многіх калектыўных выстаў і конкурсаў у Беларусі і за мяжой.



Карціны старых сцэн. Змешаная тэхніка; 79,5х79,5; 2017 г.



# Якубаў Андрэй Уладзіміравіч, 1975 г. н., Мінск

Навучаўся графіцы і жывапісу ў прыватных мастацкіх школах. Жыў і займаўся творчасцю ў Еўропе (Германія, Данія, Чэхія). Удзельнічае ў міжнародных пленэрах і выставах.



Выкраданне святой галавы. Афорт; 30х20,5; 2017 г.



Шэлест Тамара Генадзьеўна, 1977 г. н., Мінск

Скончыла Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (аддзяленне станковай графікі). Член Беларускага саюза мастакоў. У 1997 г. атрымала Гран-пры міжнароднага конкурсу «Marathon — Artistique» ў горадзе Невер (Францыя). У 2010 г. — званне «Фатограф года — 2010» на Нацыянальным конкурсе «Мастацтва кнігі — 2010». З'яўляецца ўдзельнікам і дыпламантам многіх калектыўных выстаў і конкурсаў у Беларусі і за мяжой.



Фота на памяць. Афорт; 24х31,7; 2017 г.



## Піскун Сафія Юр'еўна, 1982 г. н., Мінск

Скончыла Рэспубліканскі каледж мастацтваў імя І. В. Ахрэмчыка, Беларускую дзяржаўную акадэмію мастацтваў (аддзяленне станковай графікі). У 2006, 2007, 2011 гг. стажыравалася ў Акадэміі мастацтваў у Мюнстэры (Германія). Член Беларускага саюза мастакоў. Удзельнічае ў розных выставах у Беларусі і за мяжой, супрацоўнічае з выдавецтвамі дзіцячай літаратуры, займаецца экслібрысам.



Дзве прасторы. Афорт; 24,7х34; 2017 г.











# пленэр 2017










ПОЛАЦК 2017

© Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік